Источник: "Наша слова" - 2013-09-25

# У Менску прайшла вечарына, прысвечаная 70-годдзю паэткі Ніны Мацяш



20 верасня ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Я. Коласа НАН Беларусі прайшла сумесная вечарына з Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры "Шчаслівай долю назаві...", прысвечаная 70-годдзю з дня нараджэння паэткі, перакладчыцы, грамадскай дзячкі Ніны Мацяш.

Да імпрэзы аддзелам рэдкіх кніг і рукапісаў бібліятэкі падрыхтавана міні-выстава "Агмень яе душы".

- Гэта вельмі цікавы і незвычайны чалавек, выдатная паэтка, якая зрабіла вялікі ўнёсак у развіццё беларускай літаратуры і грамадскай думкі, - расказала БелаПАН загадчык аддзела навуковай асветы Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры Лідзія Шагойка. - У студэнцкія гады, калі Ніна Мацяш вучылася ў Інстытуце замежных моваў, яна трапіла ў аварыю, з-за чаго была прыкутая да інваліднага крэсла. Але аптымістка па натуры, яна сваім прыкладам паказала, як трэба жыць у самых складаных, здаецца, невераголных абставінах. Да творчасці Ніны Мацяш у Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры мы ўжо звярталіся ў красавіку мінулага года, калі ў нас адкрывалася выстава "Апякункі паэтычных нябёсаў", дзе былі прадстаўленыя дзевяць паэтак другой паловы XX стагоддзя. У дзень нараджэння гэтай выдатнай паэткі яе слова гучала не толькі тут, але і на яе радзіме ў Белаазёрску, дзе сёння праходзіць свята "Бабіна лета". Менавіта Ніна Мацяш была яго заснавальніцай, і туды выправілася вялікая дэлегацыя пісьменнікаў, якія ведалі Ніну Язэпаўну, сябравалі з ёй.

Ніна Мацяш нарадзілася 20 верасня 1943 года ў вёсцы Нівы Бярозаўскага раёна Берасцейскай вобласці. Скончыла Менскі дзяржаўны педагагічны інстытут замежных моваў.

Лаўрэат фестывалю "Берасцейская зорка-98", Літаратурнай прэміі імя Аркадзя Куляшова, заслужаная дзячка мастацтваў Беларусі. У літаратурнай скарбонцы пісьменніцы сем зборнікаў паэзіі, 15 кніг перакладаў з французскай, нямецкай, польскай, украінскай.

Дзякуючы Ніне Мацяш беларускія чытачы пазнаёміліся з творчасцю Жана Аліўе, Жоржа Сімянона, Антуана дэ Сент-Экзюперы, Віславы Шымборскай і іншых.

Сем кніжак падрыхтавала пісьменніца дзеткам, напісала некалькі тэлесцэнарыяў і п'ес для тэатра. Не стала Ніны Мацяш 19 снежня 2008 года.

*БелаПАН.*

БелаПАН. У Менску прайшла вечарына, прысвечаная 70-годдзю паэткі Ніны Мацяш